

магілёўскі
Выбар

№ 18
Кастрычнік
2012 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

ГРИГОРИЙ КОСТУСЕВ: ПУСТЬ ЛУКАШЕНКО РАЗБЕРЕТСЯ СО СВОЕЙ “ПЯТОЙ КОЛОННОЙ”



Григорий Костусев

“Кампания по так называемому бойкоту выборов позорно провалилась, показав слабость и трусость так называемой радикальной оппозиции, пятой колонны, не желающей даже имитировать борьбу за власть”, - заявил А.Лукашенко, выступая в 11 октября на заключительном заседании обеих палат парламента 4-го созыва.

А.Лукашенко подчеркнул, что не склонен проявлять злорадство в связи с провалом оппозиции на парламентских выборах. “Повода для злорадства здесь нет. Искренне вам скажу: мне жаль, что у нас так пока и не появилось нормальная, честная, ответственная оппозиция, болеющая за страну, а не за распил зарубежного подаяния”.

-Пусть Лукашенко разберется со своими чиновниками – нынешними и бывшими, которые активно скупают недвижимость на Западе и живут на награбленное в Беларуси. Вот они-то и есть самая настоящая пятая колонна: занимая высокие должности в Беларуси, они работают на ту же Россию, на нефтегазовый комплекс России. Когда наступает время – они удирают из страны, получают высокие должности в России, и безбедно живут, проживая награбленное.

Так ответил на обвинения А.Лукашенко, высказанные 11 октября, заместитель председателя Партии БНФ Григорий Костусев.

- Я до сих пор живу и работаю в Беларуси, плачу здесь налоги, живу не на ворованное – на кровно заработанные деньги. Поэтому я смело могу дать отпор Лукашенко. Пусть он разберется со своими бывшими чиновниками и идеологами. Главный идеолог Могилева вышла на пенсию и уехала жить в Германии, а до того она успела отправить в Германию свою дочь, где сейчас уютно и живут. Дочь председателя Техтинского сельсовета и директора местной школы уже живет в Германии. Бывший руководитель Брестского облисполкома Владимир Заломай живет в Калининграде.

(Окончание на стр. 2)

У ХОЦІМСКІМ РАЁНЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ З’ЯЎЛЯЕЦЦА НОРМАЙ



Вось ужо больш за тры тыдні прадстаўнікі разнастайных прадпрыемстваў і арганізацый гарадскога пасёлка Хоцімск шчыруюць на калгасных палетках, убіраючы ўраджай кармавых буракоў і бульбы.

Ва ўсіх арганізацыях працаўнікоў на працу ў сельскагаспадарчыя прадпрыемствы накіроўваюць не пытаючыся асабістай згоды, прычым у бальшыні калгасаў цяжкая праца “дабраахвотных” памочнікаў ніяк не аплочваецца. Усяго на працы па ўборцы кармавых буракоў задзейнічаны працаўнікі каля пяцідзесяці арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў Хоцімска.

“Людзі страшна абураны, яны павінны з дапамогай сваёй фактычна рабскай працы выпраўляць хібы ў арганізацыі працы ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Хоцімскага райвыканкама, – распавядае грамадскі актывіст з Хоцімска, былы кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад кампаніі “Гавары праўду” па Крычаўскай выбарчай акрузе № 83 Валерый Каранкевіч. – Кожны дзень супрацоўнікі амаль пяцідзесяці розных прадпрыемстваў і арганізацый Хоцімскага раёна

(Заканчэнне на стар. 2)

ГРИГОРИЙ КОСТУСЕВ: ПУСТЬ ЛУКАШЕНКО РАЗБЕРЕТСЯ СО СВОЕЙ “ПЯТОЙ КОЛОННОЙ”

(Оконч. Начало на стр. 1)

Где Титенков, Рахманько, где все бывшие соратники Лукашенко? Они активно скупают недвижимость на Западе (в Литве, Польше, других европейских странах, в той же России), и там спокойно жируют. Титенков и Рахманько за красивые глазки получили солидные должности в России? Нет, занимая в Беларуси высокие должности, они работали на Россию, на нефтегазовый комплекс – за это и вознаграждены. Вот это и есть та самая пятая колонна, - заявил Григорий Костусев.

В лексике Лукашенко тоже не изменилось еще с депутатских времен:

- Я помню высказывания Лукашенко в адрес БНФ еще до его президентства – ничего нового не появилось в его лексиконе.

В Беларуси ситуация движется к смене власти. Именно поэтому ярые сторонники Лукашенко бросились скупать имущество за рубежом. Подготовят запасные аэродромы – и как только запахнет жареным, покинут страну. Но от правосудия им не скрыться и на Западе – новая белорусская власть, думаю, сделает все, чтобы воздать им по их заслугам, - уверен Григорий Костусев.

“Белорусский партизан”

У ХОЦІМСКІМ РАЁНЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ З’ЯЎЛЯЕЦЦА НОРМАЙ


(Заканч. Пачатак на стар. 1)

выязджаюць у сельгаспрадпрыемствы, каб прыбіраць кармавыя буракі. Прычым ніякай згоды ў людзей ніхто не пытаецца, на ўсе пытанні ў кіраўніцтва адзін адказ “не падабаецца – звальняйцесь”. Выкарыстоўваюць і працу непоўналетніх – навучэнцаў Хоцімскага ліцэя і мясцовых школ. Прычым у бальшыні сельскагаспадарчых прадпрыемстваў людзі працуюць “за дзякуй”, пра нейкую аплату за цяжкую працу нават размовы не ідзе. Працаўнікі вымушаны падпарадкоўвацца загадам кіраўніцтва пад пагрозай звальнення, бо нейкую больш-менш прыстойную працу ў Хоцімскім раёне знайсці вельмі цяжка. Аднак людзі ўжо не маўчаць, яны выказваюць свае думкі ў голас”.

Пра тое, што ў Хоцімскім раёне ў 21 стагоддзі супрацоўнікі арганізацый і прадпрыемств гарадскога пасёлка вымушаны “за дзякуй” працаваць на калгасных палетках, напісала нават мясцовая раёнка “Шлях кастрычніка”. Яна ж паведаміла, што чыннікам гэтага сталась тое, што ў Хоцімскім раёне ў ёсць толькі адзін буракаўборачны камбайн у СВК “Акцябр-Бярозкі”, ды і тэй паламаны.

“Нават “Шлях кастрычніка” закрануў тэму прымусовай працы на ўборцы буракоў, бо абурэнне ў людзей вельмі вялікае, – кажа Валерый Каранкевіч. – Звычайна газета піша толькі пра дасягненні і росквіт Хоцімскага раёна. Але тут увесь “росквіт” бачны не ўзброеным вокам – на ўвесь раён няма ніводнага спраўнага буракаўборачнага камбайна і ўраджай у калгасах можна ўбраць толькі пры дапамозе рабскай безаплатнай працы супрацоўнікаў арганізацый і прадпрыемстваў гарадскога пасёлка. І гэта 21 стагоддзе”…

Багдан Іваноў



ЛЕАНІД ЗАІКА: ДЭВАЛЬВАЦЫЯ БУДЗЕ. АЛЕ НЕ АБВАЛЬНАЯ



Леанід Заіка

Эканаміст параўноўвае сітуацыю з беларускім рублём сёлета, у 2008-м і 2010 г.

“Я хацеў бы супакоіць тых, хто нас чытае. Прыкметаў таго, што адбудзецца рэзкая дэвальвацыя, пакуль няма”, – гаворыць Леанід Заіка. Ён не сцвярджае, што сёлета на сітуацыю ў эканоміцы не ўплывае павелічэнне грашовай масы.

“Але калі браць папярэднія гады: 2008-мы, 2010-ты, – мы мелі значны негатыўны гандлёвы баланс. Сёлета, у першай палове года, у нас быў станоўчы гандлёвы баланс. Пасля таго, як спыніўся імпарт нафты, ён стаў практычна нейтральны”. Таму да канца года дэвальвацыя можа сягнуць 3–5 % да цяперашняга ўзроўню курсу.

“Я мяркую, што Нацбанк зрабіў высновы з мінулага года і будзе весці больш абачлівую палітыку рэгулявання грашовай масы”.

Тое, што беларусы пачалі здымаць уклады ў беларускіх рублях, эканаміст называе “сталеннем”: “Укладчыкі сталі паводзіцца рацыянальна <...> Дэпазіты сталі пераводзіць з беларускіх рублёў у долары і еўры. Гэта нармальная рэакцыя”. Паводле Леаніда Заікі, гэта сведчанне таго, што беларусы рэагуюць не на заявы старшыні Нацбанку, а на рэальную сітуацыю.

belsat.eu

ШТРАФУЮЩЕЕ ПРАВОСУДИЕ-2

Непрерывный рост штрафоприменения, о чём мы писали в прошлый раз, может иметь разные причины и, соответственно, различное объяснение этого явления. Но независимо от выдвигаемых версий нельзя отрицать того, что с каждым годом увеличивается количество оштрафованных белорусских граждан. Это при том, что за последние годы население Беларуси сократилось на несколько десятков тысяч человек. Вырисовывается странная закономерность — чем меньше в стране становится людей, тем больше штрафов они получают.

Подкрепим сделанные рассуждения цитатой из правительственной газеты «Рэспубліка». В июле текущего года здесь напечатали письмо минчанина Н. Демидовича, который без излишних обиняков спрашивал: «Почему-то СМИ в основном контролируют ситуацию, складывающуюся в стране с преступностью, рассказывают об уголовных правонарушениях. А, по-моему, надо бить в колокола по поводу того, что наш, в общем-то, толерантный белорусский народ почему-то стал правонарушителем. Задумайтесь: около трех миллионов граждан в год привлекается к административной ответственности!» («Рэспубліка» - 11.07.2012).



Редакция переадресовала письмо в Генпрокуратуру РБ, где заместитель Генерального прокурора Беларуси Николай Куклис подтвердил, что «в Беларуси в прошлом году зарегистрировано 2,7 млн. административных правонарушений (в 2010 году — 2,6 млн.)». Выходит, действительно, законопослушность белорусов под вопросом и среди них находятся миллионы правонарушителей.

Развивая актуальную тему, мы обратились к изучению официальных статистических данных. Статистика свидетельствует, что число административных правонарушений, по которым органами внутренних дел выносятся постановления о наложении административного взыскания, растёт просто необычайными темпами. Если в 2008 году было вынесено 1 млн. 918 тыс. постановлений, то в 2011 году уже 2 млн. 728 тыс. Это, в свою очередь, обусловило аналогичный рост штрафоприменения. Вот данные, которые говорят сами за себя: 2007 год — 185 тысяч штрафов, 2008 год — 296 тыс., 2009 год — 320 тыс., 2010 год — 310 тыс., 2011 год — 324 тыс.

Увеличение административных правонарушений зафиксировано во всех регионах страны. Думается, что и количество оштрафованных граждан в этих районах также существенно выросло, подрывая миф о толерантном и законопослушном белорусском народе. Или всё-таки всё дело в том, что государство посредством штрафных санкций заполняет финансовые бреши в прохудившемся бюджете? Решать вам, уважаемые читатели.

Тимур НЕЗВАНОВ

МОГИЛЕВСКИЙ "ЖИЛКОМХОЗ" ЗАСТАВИЛИ ВЕРНУТЬ В БЮДЖЕТ ДЕНЬГИ

Более 400 миллионов рублей незаконно получило из бюджета МУКП "Жилкомхоз". Деньги пришлось вернуть.

Борцы с экономическими преступлениями УВД Могилевского облисполкома провели проверку финансово-хозяйственной деятельности МУКП "Жилкомхоз" и выяснили интересные детали того, как коммунальное предприятие получало из бюджета деньги и на какие цели их тратило.

Как было установлено в ходе проверки, предприятие незаконно получило более 440 миллионов рублей из бюджета в качестве возмещения расходов за оказанные в 2011 году жилищно-коммунальные услуги населению сверх установленных норм.

По требованию УВД незаконно полученные средства были возвращены в бюджет.

Напомним, что в Беларуси установлены нормы потребления воды и электричества для населения.

El.by

БЫХАЎСКІ ЗАМАК РАЗБУРАЕЦЦА: НЯМА ГРОШАЙ

У райцэнтры Быхаў, што на Магілёўшчыне, разбураецца замак. Гэта помнік архітэктуры сямнаццатага стагодзьдзя — адзінае ацалелае замкавае збудаваньне ва ўсходняй Беларусі. Улады спасылаюцца на тое, што на рэканструкцыю няма сродкаў.

Доўгі час у мурах замка разьмяшчаліся розныя вытворчасьці. Цяпер ён занепадае. Муры дзе-нідзе абрынуліся. Пажар зьнішчыў частку даху. Ацалелы дах не вытрымлівае непагадзі. Па сьценах сьцякае вада, вокнаў няма. Да таго ж сьцены разбурае і расьліннасьць. Аварыйны будынак не агароджаны. Трапіць у яго можа кожны ахвотны:

«Помнік архітэктуры сямнаццатага стагодзьдзя знаходзіцца ў жахлівым стане. У 2004 годзе мясцовыя ўлады невядома на якіх падставах здалі помнік у арэнду прыватнаму прадпрымальніку. У выніку згарэў дах, агаліліся апорныя муры, і разбурэньні сталі незваротнымі. Ад уладаў не патрабуецца ніякай рэстаўрацыі — патрабуецца кансэрвацыя. Агароджа й вартаўнік. Хаця б гэта», — кажа жыхар Быхава, мясцовы журналіст Сяргей Антонаў.

Першы паверх замка вымецены. На другім — вэрхал. Коміны разбураныя. Сяргей Антонаў кажа, што апошні карыстальнік будынка шукаў у дымаходах скарбы.

У Быхаўскім райвыканкаме не хаваюць, што замак разбураецца, але прызнаюць, што сродкаў на рэстаўрацыю трэба надта шмат:

«У нас Цэнтар па рэстаўрацыі на мінулым тыдні быў, дык супрацоўніца сказала, што для аднаўленьня гэтага помніка патрэбна на сёньняшні дзень блізу 100 мільярдаў, а гэта дужа вялікія грошы. Сказала, што сьцены й скляпеньні ў добрым стане, а па падмурку будуць выклікаць спэцыялістаў. Пытаньне цяпер стаіць, ці ёсьць наагул магчымасьць яго аднавіць», — патлумачыла сытуацыю супрацоўніца аддзелу архітэктуры й будаўніцтва райвыканкаму.

У райвыканкаме ўдалося высьветліць, што на кансэрвацыю замка нібыта выдзелена каля двух мільярдаў рублёў. Службоўцы прызнаюць, што гэтых грошай на ўвесь аб’ём працаў ня хопіць. Нават на рамонт даху.

Тое, што засталося ад замка, прыяжджаюць аглядаць турысты зь іншых мясьцін Беларусі. Гутару з двума студэнтамі зь Берасьця:

Юначка: «Я ў жаху ад самога стану будынка. Месца добрае, але вось беспарадак гэты палохае».

Юнак: «Мы наагул з заходняй Беларусі. У нас з гэтым справы выглядаюць нашмат лепей, чым тут. Тут наагул пра захаванасьць помніка гаварыць не выпадае. Тут нават дрэвы ня выкарчаваныя. Растуць проста ў замку. Такі турыстычны аб’ект, а ў Быхаве іх ня шмат, і ў такім стане. Жудасьць творыцца».

Жыхары самога Быхава важнасьць замка для гораду разумеюць, але прызнаюць, што спадзеву на яго ратаваньне няшмат. Вось характэрнае меркаваньне:

«Разбураецца, так. Зразумела, гэта ненармальна. Яго трэба рэстаўраваць, але, напэўна, сродкаў няма ў бюджэце на гэтыя мэты. Гэта гістарычны помнік знакавы — даўно ўжо стаіць. Мы яшчэ дзецьмі былі, па ім бегалі. Неяк ён ужо даўно ў такім заняпадзе».

Быхаўскі замак узьвялі як абарончае збудаваньне ў першай палове сямнаццатага стагодзьдзя. Належаў ён гетману Вялікага Княства Літоўскага Яну Хадкевічу. Потым ім завалодалі Сапегі. Цяпер заняпалая цытадэль узвышаецца па-над крутым схілам абарончага рова. З вакон відаць шырокі дняпроўскі поплаў. Акрамя самога замка, пакрысе разбураюцца і збудаваньні навокал яго. Напаўразбуранай стаіць замкавая вежа. Непадалёк ад замка закансэрваваны ўнікальны будынак сынагогі, узьведзены ў абарончым стылі.



Сяргей Антонаў

Радыё “Свабода”

У МАГІЛЁВЕ МУЖЧЫНА СПРАБАВАЎ СКОЧЫЦЬ З ТРУБЫ ЗАВОДА ВЫШЫНЁЙ 105 МЕТРАЎ

Амаль дзве гадзіны псіхолагу МНС прыйшлося адгаворваць невядомага мужчыну ад скачка з трубы вышынёй 105 метраў у Магілёве.

Гэта здарылася вечарам 13 кастрычніка. У 20.36 да ратавальнікаў паступіла інфармацыя, што невядомы мае намер скокнуць з неэксплутаванай трубы на тэрыторыі ААТ «Завод штучнага валакна».

У 23.59, пасля пераконвання псіхолага, мужчына спусціўся на зямлю і ўцёк. Яго асоба міліцыі ўстанавіць не атрымалася.

ПРОИЗВОДИМ? ЭКОНОМИМ? МОДЕРНИЗИРУЕМ?

В последнее время читать государственные газеты стало просто невозможно. Нет, наверное, ни одной сферы нашей жизни, где они не извратили или оболгали действительность. Можно брать наугад любое общественно значимое событие, чтобы убедиться в том, что на страницах госСМИ нам рассказали полуправду, а то и вовсе умолчали о нём. Вспомните скандальный полёт шведского самолёта через белорусскую границу, провальную Олимпиаду, имитацию выборов в парламент. Но ещё хуже положение с объективностью оценок на страницах районных газет. Они должны писать о местных реалиях, но вынуждены делать это с оглядкой на районное руководство. Редакторам районок не позавидуешь, впрочем, все они сами выбрали свою незавидную долю.

6 октября климовичская районная газета «Родная ніва» опубликовала большой материал о работе ликёроводочного завода. Под статьёй стоит фамилия редактора газеты Никифора Минченко. Надо полагать, что название «Производим. Экономим. Модернизируем» тоже его.

Из текста материала читатели узнают о модернизации производства ЛВЗ, новых линиях розлива, а также о современном спиртзаводе в Костюковичах. И даже о том, что на предприятии много внимания уделяется спорту. Мы не хотим сказать, что всё это неправда. Да, названы реальные факты, прозвучали конкретные фамилии и цифры. Но вместе с тем объективностью статья Н. Минченко не отличается.

Трудно поверить, чтобы в редакции не знали о том, что сообщали про завод в республиканских СМИ всего за десять дней до публикации в «Роднай ніве». Если не знали, то какие они, позвольте спросить, журналисты? Или, может, у них такая специфическая память, что они забывают о событиях недельной давности? Чувствуется, что здесь необходимо напомнить о том, что услышала вся страна. Заодно прочитают и читатели «Роднай нівы», которым не рассказали об этом в районке.

26 сентября телеканал ОНТ дважды посвятил новостные выпуски концерну «Белгоспищепром». Сообщалось, что Комитет госконтроля проверил, как концерн использует средства на модернизацию. О результатах проверки можно судить уже по одному факту, что 25 должностных лиц были привлечены к административной и дисциплинарной ответственности.



По информации госконтроля «за два года предприятия «Белгоспищепрома», по сути, впустую потратили около 4 миллиардов из инновационных фондов». Отдельное упоминание, в связи с этим, ОНТ и КГК уделили Климовичскому ЛВЗ. Вот что прозвучало в теленовостях: «Климовичский ликёроводочный завод ещё в далёком 2008 году потратил на новую линию ровно 1 млн. евро. Но часть оборудования спустя четыре года так и лежит на складе. Наверное, потому, что другая часть, по версии ревизоров, украдена».

Председатель КГК Александр Якобсон конкретизировал детали. Агентство БЕЛТА передало с его слов следующее: «После изменения технологии оказалась ненужной часть закупленного оборудования стоимостью около 700 млн. руб., из которого отдельные агрегаты на сумму 520 млн. уже около четырёх лет лежат на складе, на 100 млн. оборудование продано, остальное украдено».

Досталось и Костюковичскому спиртзаводу, о котором упоминалось в публикации «Роднай нівы». В официальном сообщении КГК сказано: «Ярким примером отсутствия должного контроля со стороны концерна «Белгоспищепром» за реализацией инновационных проектов является Костюковичский спиртзавод РУП «Климовичский ликеро-водочный завод». Оказывается, в 2010 году на спиртзаводе стали использовать дорогое оборудование, а в 2011–м опять вернулись к старым методам. В итоге себестоимость продукции увеличилась в 1,3 раза. К тому же целых два года ЛВЗ платил немаленькие деньги российскому профессору, помогающему внедрить в Костюковичах передовые технологии брагоректификации спирта. Но, не доведя дело

(Окончание на стр. 6)

ХОЦІМСКІЯ ЎЛАДЫ НА ЗВАРОТЫ ГРАМАДЗЯН РЭАГАВАЦЬ НЕ ЖАДАЮЦЬ

Раённыя ўлады Хоцімскага раёна ўжо на працягу некалькіх месяцаў фактычна ігнаруюць звароты жыхароў вуліцы Пушкінскай Хоцімска, якія дамагаюцца таго, каб іх вуліца была адрамантаваная належным чынам, як гэта абяцалі рознага ўзроўню чыноўнікі.

Між тым жыхары гэтай вуліцы нават не атрымалі пісьмовага адказу на свой апошні зварот да начальніка галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення КДК Герасімава В. М. па пытанні правядзення рамонту дарожнага пакрыцця. Адказ на зварот мусіў быць дасланы ім да 1 кастрычніка бягучага году.

“У мяне складваецца ўражанне, што хоцімскім чыноўнікам няма ніякай справы да простых людзей, - кажа грамадскі актывіст з Хоцімска Пётр Басейка. – Выбары ў “палатку” прайшлі, паказуха з клопатам пра народ ужо непатрэбная, і яны нават перасталі адказваць на нашы звароты. Я ўжо стаміўся абіваць парогі самых розных начальнікаў па пытанні рамонта дарожнага пакрыцця на вуліцы Пушкінскай - а справа ніякім чынам не скранулася з месца. Між тым на прёме яшчэ напрыканцы ліпеня старшыня Хоцімскага райвыканкама Фёдар Вішнеўскі асабіста абяцаў мне, што сітуацыя будзе выпраўлена, будзе зроблены добры рамонт дарогі. Але і зараз па вуліцы Пушкінскай немагчыма прайсці”.

Калектыўны зварот з патрабаваннем адрамантаваць праезжую частку дарогі па вуліцы Пушкінскай у Хоцімску, пад якім падпісаліся сорак жыхароў гарадскога пасёлка, быў накіраваны ў мясцовы райвыканкам яшчэ 22 чэрвеня. Пасля гэтага начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Хоцімскага райвыканкама Д. Кокатаў адказаў грамадзянам, што “асабістых сродкаў на ўкладку асфальта-бетоннага пакрыцця” Хоцімскі жылкамгас не мае, але ўсё ж на ўчастку вуліцы Пушкінскай “будзе зроблены ямачны рамонт дарожнага пакрыцця ў III квартале 2012 года”.

“Рамонту так і не зрабілі, - кажа Пётр Басейка. – Я зноў пачаў абіваць парогі розных начальніцкіх кабінетаў, звяртаўся да начальніка аддзела па зваротах грамадзян райвыканкама Наталлі Холалавай, начальніка аддзела архітэктуры і будаўніцтва Д. Кокатава, дырэктара жылкамгаса Сяргея Кудраўцава, старшыні райвыканкама Фёдара Вішнеўскага і, у рэшце рэшт, да начальніка галонага экспертна-прававога ўпраўлення КДК В. Герасімава. Паўсюль атрымлівае абяцанкі, што сітуацыя будзе выпраўлена. Мне ўжо самому сорамна перад жыхарамі вуліцы Пушкінскай, а чыноўнікам няма да іх праблем ніякай справы. Мне нават не даслалі пісьмовага адказу на мой зварот да начальніка галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення дзяржкантролю В. Герасімава, хоць дырэктар Хоцімскага жылкамгасу Сяргей Кудраўцаў 14 верасня пісьмова паведамляў, што гэты адказ будзе дадзены да 1.10.2012 года”.



Пётр Басейка

9 кастрычніка грамадскі актывіст пабываў на прыёме ў начальніка аддзела па зваротах грамадзян Хоцімскага райвыканкама Наталлі Холалавай, пасля накіраваўся да намесніка старшыні райвыканкама Жаны Казаковай, аднак тыя не пажадалі адказаць штосьці канкрэтнае на звароты грамадзянаў, зноў паабяцалі даслаць пісьмовы адказ. Спрабаваў Басейка патрапіць на прыём і да старшыні райвыканкама Фёдара Вішнеўскага, аднак сакратар яго не пусціла, сказала, што ён вядзе прыём грамадзян раз на месяц у вызначаны дзень.

“Вось так у нас у Хоцімску чыноўнікі ставяцца да зваротаў грамадзян, затое на нарадах вельмі шмат распавядаюць пра тое, як шмат увагі надаецца простым людзям у раёне і як добра дзейнічае прынцып “аднаго вакна”. На самай жа справе ў людзей няма ніякіх правоў, раён жыве па прынцыпе “я начальнік – ты дурак”, - абураецца Пётр Басейка.

Іван Барысаў

ПРОИЗВОДИМ? ЭКОНОМИМ? МОДЕРНИЗИРУЕМ?

(Оконч. Начало на стр. 5)

до логичного завершения, от сотрудничества с профессором отказались. Оплата командировочных и консультаций в размере 114 миллионов — это теперь деньги, потраченные впустую.

Резюмируя вышесказанное, отметим, что в новостях ОНТ по поводу проверки «Белгоспищепрома» пришли к следующему выводу: «Материалы, связанные с закупками оборудования, сейчас изучает Департамент финансовых расследований. Не исключено, что там уже запахнет уголовными делами». Многочисленные факты свидетельствуют, что подобный вывод сделан не зря. И только «Родная ніва» рассказывает своим читателям о совершенно иной реальности, будто надеясь, что климовчане не читают других газет и не смотрят телевизор.

Тимур НЕЗВАНОВ

ЧЬИ ВЫ, ХЛОПЦЫ, БУДЕТЕ?

Все чаще и чаще в нашем обществе слышишь мнение, что нация спивается. И ведь люди правы. Приведу пример: пошли с внучкой гулять по деревне в теплое августовское утро по еще не высохшей от росы траве. Идиллию прогулки нарушила довольна большая компания людей – человек двадцать мужчин и женщин, сидя на лавочке, пили водку. Многие уже были не в состоянии реально оценивать ситуацию, а потому вели себя неадекватно. Конечно, прогулка была испорчена, но порадовалась за отца внучки, который ведет трезвый образ жизни и активно занимается спортом.

Конечно, печально, что к бутылке в этот ранний час прикладывались чьи-то отцы и дедушки, но, самое страшное, и матери тоже. Неужели они никому не нужны, эти еще моложавые женщины – ни семье, ни властям, ни работодателям? Зашла в «свой» магазин и читаю, что спиртное продается с 10-00. Но откуда пьяные? Сомнения развеяла продавец уже знакомой репликой, что нация спивается(!), а у магазина выручка от нововведений в ограничении продажи спиртного упала практически наполовину, особенно, когда «дни трезвости». Да и «точек» по продаже самогона и «бырла» до 50 насчитывается в деревне, в которой только 150 всех дворов. На прилавках магазинов спиртное присутствует, но только дорогое и в виде водки, коньяка и бальзама.

А ведь в самой главной газете Беларуси («Советская Белоруссия») написано, что не алкоголики, а массовое пьянство является проблемой для Беларуси. Согласна, но, видя на месте ситуацию с реализацией алкоголя, понимаю, что спаивание населения не только эффективный процесс получение прибыли, но и сознательное оболванивание народных масс. В Шкловском районе это наблюдение стало до такой степени реальным, что райисполкомом принято решение о ограничении реализации алкогольных, слабоалкогольных напитков и пива по всему району. В пользу данного решения резкий рост потребления алкоголя (до 14 литров чистого спирта на душу населения), полторы тысячи «пьяных» административных нарушений, гибель 12 человек, 10 дорожно-транспортных происшествий. Но есть и вопрос к местным властям – как можно было за короткое время довести «президентский» район до такого состояния, что он попал в зону социального эксперимента? Или опять кто-то виноват в данной ситуации, кроме государственных чиновников, призванных улучшать жизнь в районе?

Социологи выявили причины «напиться» у народа: низкий уровень жизни; отсутствие интересных занятий в свободное время; неправильное воспитание в семье; тяготы повседневной жизни; питейные традиции и обычаи. Уже только из этого посыла можно сделать определенные выводы и разработать комплекс мер, более эффективных, чем разные запреты.

Я думаю, что читателям будут интересны новые исследования российских ученых, касающихся алкоголизации населения. Так вот, российские врачи считают, что основной причиной всех российских бед, связанных с алкоголем, является как раз злоупотребление крепкими спиртными напитками - 75,6% пациентов российских наркологических клиник употребляют водку. Доктор медицинских наук Александр Немцов в исследовании причин и механизмов возникновения зависимости от спиртного подтверждает, что у алкоголиков преобладает смешанный тип потребления, в котором доминируют большие градусы. Врач уверен, что классификация алкоголизма по типам напитков не возможна.



В частности, он сообщил, что не находит подтверждения тезис о существовании так называемого «пивного» алкоголизма: доля пива в общем количестве ежегодно потребляемого в стране алкоголя не превышает 20%. В запое пиво предпочитают только 8% пациентов наркологических клиник.

Российские специалисты считают: чтобы снизить заболеваемость и смертность от алкоголя в стране надо срочно начать бороться со злоупотреблением крепким алкоголем мужчинами трудоспособного возраста, с нелегальным производством спиртного и с его продажами несовершеннолетним. «Алкогольная политика должна быть комплексной», — уверены они. Особенно важно, по мнению врачей, социальное благополучие граждан, ведь зависимость масштабов алкоголизма от уровня доходов населения доказана во всем мире. Больше всех пьют люди с невысоким достатком, причем в период затяжных праздников. Так что рецепт трезвости для россиян сегодня

(Окончание на стр. 8)

ПОСТАВЬТЕ ПАМЯТНИК ДЕРЕВНЕ, ЧТО УМЕРЛА КАК ЧЕЛОВЕК

В Климовичском районе появился памятный знак несуществующей деревне. Десять лет назад деревня Совна прекратила своё существование. Жители разъехались, дома опустели, пастбища и поля заросли. Сегодня о Совне вспомнили лишь потому, что не забыл свою малую родину знаменитый уроженец.

Сейчас на месте некогда многолюдной деревни чистое поле. Опустевшие избы и хозяйственные постройки снесены, только кое-где в зарослях виднеются останки строений. Этот населённый пункт исчез даже с географических карт, когда последнее население перебралось в город. Без войн и катастроф Совна вымерла естественным путём, что, к сожалению, типично для нашего времени.

Идея открыть мемориал в память о родной деревне принадлежит Николаю Яковлевичу Крупинину. Известный учёный-эколог, давно проживающий в России, нашёл время и средства, чтобы реализовать задуманное. Он не только за свой счёт поставил необычный памятник, но и помог собрать земляков на открытие мемориала.

Открытие знака состоялось 27 сентября, в день, когда Совну освободили от фашистов. У подножия монумента Николай Крупинин заложил капсулу с землёй из Иерусалима. На верхушке памятника — аист, улетающий из родимого гнезда. На мемориальных плитах выбиты 348 имён. Это имена жителей, тех, кто когда-то жил в Совне, в том числе и погибшие во время войны.

На открытие собрались бывшие односельчане, многих отыскали только по интернету. Встреча под открытым небом со слезами на глазах получилась очень волнующей. Память о Совне, запечатленная в граните, навсегда останется в людских сердцах.

Александр ВЛАД

ЛИЧНОЕ ДЕЛО:

КРУПИНИН Николай Яковлевич — родился 27 октября 1951 года. Родители: мать Анастасия Стефановна - доярка, отец Яков Григорьевич - бригадир полеводческой бригады. Окончил Брянский технологический институт, работал в сфере природопользования. Заслуженный эколог РФ, академик Российской академии естественных наук, доктор экономических наук, живёт в Ханты-Мансийске.

ЧЬИ ВЫ, ХЛОПЦЫ, БУДЕТЕ?

(Оконч. Начало на стр. 7)

выглядит примерно так: стремиться к финансовому благополучию, больше работать, в меру употреблять некрепкий качественный алкоголь и только после 18 лет. У белорусских властей иные подходы.

На мой взгляд, чтобы уберечь от алкоголя молодое поколение, нужны: запрет на рекламу алкоголя; ограничение производства плодово-ягодных вин; более высокие цены на спиртное; запрет продажи спиртного лицам, не достигшим 21 года; введение уголовной ответственности за подобные деяния. Но, главное, необходимо занять умы юных искателей приключений продуктивными занятиями.

Валентина Добрая

Анекдот дня

— Алло, секс по телефону?

— Нет, налоговая, но мы тоже умеем!

НА МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАХ ПАРТЫЯ БНФ ПЛАНУЕ ВЫЛУЧАЦЬ “ЯК МАГА БОЛЬШ” КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ



На чарговых мясцовых выбарах Партыя БНФ плануе вылучаць “як мага больш” кандыдатаў у дэпутаты, такое рашэнне было прынята падчас паседжання Сойму партыі, які прайшоў сёння ў Мінску. «Палітычная камісія партыі лічыць, што “ўжо зараз трэба даць даручэнне кіраўнікам рэгіянальных структур фарміраваць папярэдні спіс кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў,” – кажа намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў.

– Адназначна, што Партыя БНФ прыняла рашэнне ўдзельнічаць у мясцовых выбарах праз вылучэнне сваіх кандыдатаў і рашэнне, каб як мага больш ахапіць рэгёнаў. Кожнаму сябру партыі, які прыме рашэнне вылучацца ў якасці кандыдыта ў дэпутаты, будзе прадастаўлена права самому вырашаць фармат удзелу ў выбарчай кампаніі –ісці да канца або здымацца.

Падчас паседжання Сойму Партыі БНФ была дадзенка ацэнка прайшоўшых парламенцкіх выбараў і стратэгіі партыі адносна ўдзелу ў іх. Сябры партыі БНФ таксама абмяркоўвалі стратэгію на будучыя прэзідэнцкія выбары. Партыя БНФ выступае за адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыі, а ў якасці механізма яго вылучэння прапануе правядзенне Кангрэса дэмакратычных сілаў.

магілёўскі Выбар

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб, аг-к В. Машчаніца, вул. Савецкая, д.4. Тэл. 8 - 0259 204 308, e-mail: Boris152@gmail.com. Выдавец Міхайлаў Іван Барысавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 16.10.2012 г. у 11-00.